Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (596) Пятніца, 2 красавіка 1965 г. Год выдання XVIII-ы Цана 1 кап.

## І ВУЧЫЦЬ, І ВЫХОЎВАЦЬ!

Чарговы сход камуністаў універсітэта, які адбыўся 26 сакавіка, быў прысвечаны аднаму з самых важных звенняў нашай работы. Пагэтаму і гаворка на ім ішла вялікая і сур'ёзная, канкрэтная і дзелавая. Тон задаў станоўча ацэнены затым у спрэчках даклад С. Я. Янчанкі «Аб стане і мерах палепшання палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў». Дакладчык спыніўся на шматлікіх пытаннях, пачынаючы з выкладак аб пасляховасці студэнтаў, аб наведванні лекцый і адносінах да іх, аб студэнцкіх навуковых гуртках, аб ролі куратара ў групе і паводзінах у інтэрнаце і канчаючы крытыкай парадку для факультэцкіх і курсавых сходаў, якія часам бываюць да нуднага сумныя ў сваёй шаблоннасці. Такім чынам, дакладчыку ўдалося ахапіць вопыт шматлікіх форм навукова-выхаваўчай работы. «Якая з іх вядучая?» — ставіў пытанне дакладчык, і ўсім сваім дакладам адказваў, што кожная, якая спрыяе першаснай нашай задачы — даць студэнтам глыбокія веды, выхаваць іх актыўнымі будаўнікамі камунізма. Першым у нас заўсёды павінна ставіцца пытанне аб вучобе, — гаворыць дакладчык, — студэнты-камуністы павінны даваць прыклады выдатнай вучобы і паводзін, роўна глыбокімі павінны быць адносіны як да спецыяльных прадметаў, так і да грамадскіх навук. Клопатам аб паглыбленні работы ўсіх грамадскіх арганізацый — асабліва камсамольскіх і прафсаюзных, аб падняцці ролі студсаветаў, аб набліжэнні кожнага выкладчыка да студэнта, аб стварэнні творчай працоўнай атмасферы ў кожнай студэнцкай групе былі прасякнуты заключныя словы даклада. І яшчэ гаварылася ў ім, што трэба выхоўваць і пэўнымі адміністрацыйнымі мерамі, што больш правамоцнымі трэба зрабіць нашы камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, вышэй падняць узровень крытыкі і самакрытыкі.

Многа ўвагі і ў дакладзе і ў спрэчках было ўдзелена ролі куратара. Аб узмацненні кантролю за работай куратара гаварыла З. Г. Грыгор'ева. Яна падкрэсліла, што на матэматычным факультэце іх працай цікавяцца і партбюро, і кафедры, вучоны савет, а таксама прафсаюзная арганізацыя. Са слушнаю перасцярогай З. Г. Грыгор'евай не скоўваць ініцыятывы групы, не рабіць так, каб яна залішне пакладалася толькі на куратара згадзіліся затым і выступіўшыя выкладчыкі і студэнты.

«На якіх пытаннях мы павінны спыняць увагу нашых выхаваццеляў?» — гэтак пачаў сваё выступленне А. М. Казарын (фізічны факультэт). На выхаванні камуністычных адносін да працы, на выхаванні любві да сваёй спецыяльнасці, — гаворыць ён, — на барацьбе з уплывамі буржуазнай ідэалогіі, развенчванні палітычнай пасіўнасці, вульгарных адносін да працы. Метады выхаваўчай работы, — падкрэслівае А. М. Казарын павінны быць гібкія і рухомыя. Маючы на воку кожнага студэнта, цэнтр увагі перанесці на групу, а узначальваць работу павінна партгрупа курса. А. М. Казарын гаворыць, што на фізфаку рашылі ўвесці штогодныя характарыстыкі на студэнтаў.

Аб ролі дзелавога аўтарытэта і агульнага ўзроўню выкладчыка ў справе выхавання студэнта гаварыў М. А. Паўленка (філалагічны факультэт). І ён і затым М. Г. Рафальскі (хімічны факультэт), студэнты Шауляцьеў, Сучкоў гаварылі аб спалучэнні вучэбнай працы, працы ў лабараторыях з выхаваўчай работай.

Аб тым, што не заўсёды ўсе мажлівыя формы выхавання мы выкарыстоўваем, гаварыў Шауляцьеў: няма ў нас радыёгазеты, «Камсамольскі пражэктар» трэба было б мець на кожным факультэце, рэдкія ў нас і фотагазеты, і добрыя стэнды, плакаты.

Больш патрабавальнасці, менш скідак! — гэтыя словы гучалі і ў выступленні выкладчыка А. М. Казарына і студэнта К. Сучкова. Развязаць ініцыятыву саміх камсамольцаў, ствараць атмасферу нецярпімасці да праяў апалітычнасці, да гультаёў і абібокаў, праводзячы агульныя мерапрыемствы, не забываць за імі жывога чалавека — аб гэтым добра гаварылі і самі студэнты.

На выхаванне ўплывае кожная дробязь, і нават тое, як мы паводзім сябе на сходах — таксама выхаваўчы момант, — адзначалі Е. П. Кесарэва і М. А. Паўленка.

З разгорнутым словам выступіў на сходзе рэктар універсітэта А. Н. Сеўчанка. «Бяда наша, — гаварыў ён, — што мы часам, бачачы недобрасумленныя адносіны некаторых выкладчыкаў да сваіх абавязкаў, у час не спыняем іх. Свята выпаўняць усе свае абавязкі — гэтага ад нас патрабуе Партыя і наш урад, і ў гэтым залог пасляховай палітыка-выхаваўчай работы».

Шмат увагі А. Н. Сеўчанка удзяліў справе наладжвання кантролю. Асабліва за якасцю лекцый. Іх павінны наведваць загадчыкі кафедр, дэканы, яны павінны абмяркоўвацца на кафедрах. Выкладчык не павінен адставаць ад сучаснага ўзроўню развіцця навукі.

Многа гаварыў таксама А. Н. Сеўчанка аб перспектывах развіцця універсітэта, аб некаторых цяжкасцях, якія складваюцца ў сувязі з забеспячэннем універсітэта навуковымі кадрамі і якія неабходна пераадолець.

«Нашы студэнты ў асноўнай сваёй масе добрыя, — заключае рэктар універсітэта, — і ёсць усе перадумовы для нашай далейшай пасляховаў работы. І вучыць, і выхоўваць — наша задача!»

Па дакладу С. Я. Янчанкі сход прыняў разгорнутую пастанову, у якой намечаны важныя мерапрыемствы па далейшаму павышэнню ўзроўня вучэбнай і выхаваўчай работы сярод студэнтаў універсітэта.

А. ЛОЙКА.

ДА 20-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

## СУСТРЭЧА З ГЕРАІНЯЙ

*Калідоры філалагічнага корпуса універсітэта былі надзвычай гаманкімі: у госці да студэнтаў прыйшла Герой Савецкага Саюза, славутая лётчыца гвардзейскага палка начных пікіруючых бамбардыроўшчыкаў Надзея Васільеўна Папова. Гэты дзень супаў якраз з палётам касмічнага карабля «Усход-2» — новай надзвычайнай перамогай савецкай навукі і тэхнікі над неабдымнай прасторай Сусвету. Надзея Васільеўна горача павіншавага ўсіх прысутных з гэтай падзеяй і зусім непрыкметна пачала ўспамінаць...*



*...Надзея толькі што закончыла школу і пачала працаваць у аэраклубе лётчыцай-інструктарам, рыхтавалася да паступлення ў авіяцыйны інстытут. Але марам яе не было суджана збыцца. Вайна аддаліла іх.*

*Разам з многімі дзяўчатамі-равесніцамі Надзею паслалі на Волгу, дзе фарміраваўся першы жаночы авіяцыйны полк начных пікіруючых бамбардыроўшчыкаў.*

*Надзея Васільеўна прыгадала адзін выпадак, які здарыўся з ёю ў час сумеснага вылету з Марынай Міхайлаўнай Расковай. Аднойчы яны вылецелі на баявое заданне. У час бамбёжкі ў самалёт Паповай папаў асколак зенітнага снарада. Самалёт пачаў даваць крэн. Не разгубілася адважная лётчыца, яна падруліла свой самалёт да самалёта Расковай і дзве савецкія стальныя птушкі літаральна бок аб бок працягвалі палёт, пакуль не прызямліліся на аэрадроме...*

*І яшчэ доўга Надзея Васільеўна расказвала студэнтам цікавыя эпізоды з свайго жыцця...*

*Ад імя студэнтаў філфака выступіў Уладзімір Вялічка. Ен горача падзякаваў Надзеі Васільеўне Паповай за расказ, заверыў яе, што яны з гонарам праз усё жыццё пранясуць эстафету старэйшага пакалення, памножаць яго слаўныя традыцыі.*

*К. МОХАР,*
*студэнт 1-га курса аддз. журналістыкі.*

**НА ЗДЫМКУ:** У час сустрэчы з Н. Паповай.

## Першыя дыпломныя абаронены

Калі для многіх студэнтаў гарачыя дні толькі набліжаюцца, то для пяцікурснікаў аддзялення журналістыкі яны пачаліся яшчэ ў самым пачатку другога семестра. Выпускнікі цяпер заканчваюць дыпломныя работы. Задача гэта нялёгкая і адказная, бо дыпломная пакажа, што ўзяў студэнт за пяць гадоў знаходжання ва універсітэцкіх сценах, як ён гатоў сустрэць выпрабаванне жыццём. Як на ўсіх франтах грамадскай працы, сярод дыпломнікаў таксама ёсць перадавікі.

Упэўненым у сваіх ведах выходзіць за кафедру выдатнік вучобы Сцяпан Говін. Тэма яго дыпломнай работы: «А. В. Луначарскі і мастацтва» пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры партыйна-савецкага друку Е. Л. Бондаравай Говін напісаў цікавую і змястоўную работу. Рэцэнзент таксама не мае ніякіх заўваг. Адзнака дыпломнай — «выдатна».

Вельмі цікавую тэму для дыпломнай работы ўзяла і Галя Грыгаровіч: «Нарыс на тэлебачанні». Адзнака дыпломнай таксама «выдатна».

Добры старт узялі журналісты. Добра было б, каб усе пяцікурснікі прыйшлі да фініша з адзнакай «выдатна».

І. КУЗЬМІН.

## Старты універсітэцкай самадзейнасці

*21 сакавіка ў АДА адбылося ўрачыстае адкрыццё трэцяй Рэспубліканскай дэкады народнага мастацтва БССР. Яе адкрылі самадзейныя артысты г. Мінска.*

*Прыемна, што права ўдзельнічаць у адкрыцці дэкады было заваёвана калектывамі мастацкай самадзейнасці універсітэта: народнай харавой капэлай, аркестрам народных інструментаў, танцавальным калектывам і дэкламатарам Т. Галынка.*

*Выдатнае выкананне рэпертуара сведчыць аб тым, што нашы калектывы па свайму майстэрству можна прыраўняць да прафесійных калектываў. Наша харавая капэла ўзнагароджана дыпломам другой ступені. Выдатна выступіў аркестр народных інструментаў. Ён атрымаў дыплом першай ступені. Спадарожнічалі поспехі і танцавальнаму калектыву універсітэта.*

*Заслужаны артыст БССР А. І. Білібін адной з галоўных сваіх задач лічыць зрабіць свой калектыў лепшым у рэспубліцы. Сваё высокае майстэрства мастака ён перадае ўдзельнікам капэлы, умела спалучаючы высокую патрабавальнасць да ўдзельнікаў з высокай культурай адносін да іх. І тое, што капэла за такі кароткі час узрасла і дасягнула высокага майстэрства, звязана з напружанай працай яе кіраўніка.*

*Многа прыйшлося папрацаваць Міхаілу Аркадзьевічу Лісіцыну — кіраўніку аркестра народных інструментаў. Ён не толькі добра падрыхтаваў калектыў да дэкады, але і канцэрт аркестра з удзелам у ім народнай артысткі СССР Тамары Ніжнікавай і саліста Беларускага радыё і тэлебачання Юрыя Смірнова.*

*Танцавальны калектыў універсітэта, на вялікі жаль, не атрымаў належнай дапамогі з боку грамадскіх арганізацый. Пытанні папаўнення калектыва і ўзмацнення яго дысцыпліны засталіся незакончанымі і цяпер. У тым, што танцавальны калектыў усё-такі пасняхова прайшоў увесь агляд, вялікая заслуга Л. К. Алексютовіч, якой прыйшлося быць не толькі яго кіраўніком, але і браць на сябе некаторыя арганізацыйныя функцыі.*

(Заканчэнне на 2-й стр.).



**НА ЗДЫМКУ:** Харавая капэла універсітэта.

## СПАРТЫЎНЫЯ НАВІНЫ

15 і 16 сакавіка турбаза «Ураджай» была запоўнена студэнцкай моладдзю. Тут на працягу двух дзён праводзіліся спаборніцтва на першынство універсітэта па лыжах. Адначасова ўдзельнічалі мужчынскія і жаночыя каманды. У першы дзень былі дадзены старты на 20 кіламетраў для мужчын і 8 кіламетраў для жанчын, а таксама змешанай эстафеты.

Многія каманды паказалі нядрэнныя вынікі, пагэтаму цяжка было аддаць каму-небудзь перавагу. Другі дзень быў таксама насычаны упартымі паядынкамі. Асабліва вялікі разрыў у рэзультатах быў у жаночых камандах. Майстар спорту геафака Вольга Фікіповіч і прадстаўнік філфака першаразрадніца Дана Усаевіч— пакінулі далёка ззаду астатніх саперніц.

У агульнакамандным заліку першыя тры месцы занялі каманды факультэтаў: фізічнага, хімічнага і філалагічнага.

# Старты універсітэцкай самадзейнасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стр.)

*Не падтрымаў нашы паспяховыя выступленні на аглядах драматычны гурток. Ён не даў ніводнага нумара, а духавы аркестр так акампанаваў танцавальнаму калектыву, што на раённым аглядзе нам параілі адмовіцца ад яго.*

*Удзельнікі самадзейнасці правільна разумеюць свае задачы, многа робяць для таго, каб зрабіць свой калектыў лепшым сярод вузаў. Рэпетыцыі нашых калектываў — гэта вялікая, напружаная разумовая і фізічная праца. З упэўненасцю магу сказаць, што ні адна грамадская работа не адымае столькі часу, як удзел у мастацкай самадзейнасці. Але гэта не перашкаджае актывістам самадзейнасці амаль усім вучыцца толькі на выдатна. Назаву некаторых з іх: І. Скурко, І. Скаскевіч, М. Гомза, Л. Сядзюк, Р. Урэцкая, Т. Ядовіна, М. Чудаяў, Т. Сімановіч і многія іншыя*

*Удзельнікі мастацкай самадзейнасці вельмі ўдзячны рэктару А. Н. Сеўчанку і сакратару парткома А. Е. Бураўскаму. Яны часта прыходзяць на рэпетыцыі калектываў, цікавяцца жыццём і вучобай іх удзельнікаў, аказваюць ім дапамогу.*

*Вельмі многае робіць для нашага калектыва старшыня праўлення клуба А. Збрыцкі. Але праўленне клуба не стала яшчэ баявым арганізатарам усіх спраў, хаця налічвае ў сваіх радах 9 чалавек. Не на належным узроўні працуе і культмасавы сектар прафкома, які ў першым семестры аказаўся ў баку ад жыцця мастацкага калектыву.*

*Трэба зрабіць папрок і ў адрас культмасавага сектара камітэта камсамола. Ён працаваў без ініцыятывы, па ўказцы і не зрабіўся яшчэ сапраўдным арганізатарам усіх мерапрыемстваў. Камітэту камсамола трэба ў самы кароткі час актывізаваць работу культмасавага сектара.*

*Безадказна працуюць і камітэты камсамола юрыдычнага, фізічнага і хімічнага факультэтаў.*



*Яны не выканалі нашай просьбы аб папаўненні капэлы мужчынскімі галасамі. На некаторых факультэтах удзельнікі мастацкай самадзейнасці не вызвалены ад другіх грамадскіх абавязкаў, хаця такія просьбы вядомы дэканатам і партыйным бюро.*

*Наш калектыў мастацкай самадзейнасці мае здольных удзельнікаў. Але нам патрэбны і новыя людзі. Бясспрэчна, на факультэтах ёсць многа студэнтаў і студэнтак з добрымі галасамі, ёсць і такія, што добра іграюць на тым ці іншым музычным інструменце. Запрашаем вас, таварышы, на нашы рэпетыцыі. Мы будзем заўсёды рады вам, вы акажаце нам гэтым самым вялікую падтрымку.*

*Намі зроблены добры пачатак у мастацкай самадзейнасці, але пачатак — палова справы. Многа трэба яшчэ папрацаваць кіраўнікам, актывістам, арганізатарам, каб зрабіць нашу ўніверсітэцкую самадзейнасць лепшай у рэспубліцы.*

*М. ПІПЧАНКА.*

**НА ЗДЫМКУ: Грацыёзна кружацца ў віхры лявоніхі танцоры.**

**Фота В. Адзіяна.**

## *Усмешкі*

### *ДОБРЫ ЛЕКТАР*

*Студэнты пра выкладчыка:*

*— Добры лектар. Не турбуе новымі думкамі...*

### *ДАПАМОГА*

*— Ну, як табе дапамагаў твой кіраўнік у напісанні дыпломнай?*

*— Ды так, нічога. Падказаў замяніць у назве тэмы слова «аграрны» на «сельскагаспадарчы».*

### *СЦІПЛЫ*

*— Хто ў вас на курсе лепш за ўсіх гуляе ў шахматы?*

*— Пятроў. Але я заўсёды яго абыгрываю.*

*І. ШПАДАРУК.*

# ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ УСЕ МАЖЛІВАСЦІ

«Кожны прыйшоўшы ва універсітэт павінен стаць грамадзянінам, які сваімі глыбокімі ведамі мог бы ўзвялічыць гонар і славу Айчыны», — пісаў выдатны рускі вучоны матэматык Н. І. Лабачэўскі.

Гэта ж вядома, што паступаюць ва універсітэт для таго, каб атрымаць глыбокія і разнастайныя веды, каб затым з поспехам прымяніць іх на практыцы.

Многія студэнты філалагічнага факультэта разумеюць свае задачы. Як правіла, той, хто добра вучыцца, выконвае і вялікую грамадскую работу, хоча больш пазнаць і зрабіць сам. Такіх студэнтаў у нас многа. Гэта — сакратар камсамольскага бюро філфака Мікола Латыш, старшыня савета СНТ Генадзь Пальцаў, члены камітэта камсамола універсітэта Віктар Леганькоў і Ніна Царэнка і іншыя. Для такіх заўсёды не хапае часу — суткі маюць усяго 24 гадзіны! А за гэтыя 24 гадзіны трэба зрабіць вельмі многае: падрыхтавацца да семінарскіх заняткаў, прачытаць літаратурныя навіны, даведацца з газет аб становішчы ў роднай краіне, за мяжой і ў дадатак выканаць грамадскія даручэнні. Але ўсяго ахапіць усё роўна нельга. Па-за ўвагай застаецца ўсё-такі вельмі многа цікавых рэчаў. Матэматыка і фізіка, хімія і біялогія, гісторыя і права — гэта далёка не поўны пералік навук, якія вывучаюцца ва універсітэце. Усяго ведаць, канешне, нельга, але філолагу цікава ведаць што-небудзь з хіміі ці фізікі, матэматыкі, ці біялогіі, а студэнтам іншых факультэтаў, у сваю чаргу, важна больш ведаць аб літаратуры і г. д.

І ў нас маюцца для абмену ведамі самыя шырокія магчымасці. Правядзенне цікавых лекцый, змястоўных дакладаў прафесарска-выкладчыцкім калектывам і студэнтамі старэйшых курсаў — вельмі важная і карысная справа. Камітэту камсамола універсітэта і яго студэнцкаму сектару трэба больш увагі звярнуць іменна на такія мерапрыемствы. Камітэту камсамола, на маю думку, трэба прадумаць і прапанаваць прафкому універсітэта і студсавету інтэрнатаў такое пытанне, як размяшчэнне студэнтаў па пакоях. У адным толькі інтэрнаце па вуліцы Паркавая магістраль жывуць і філолагі, і юрысты, і біёлагі, і журналісты. Ды кожны з іх як бы варыцца ва ўласным саку. А чаму не зрабіць так, каб у адным пакоі жылі студэнты розных спецыяльнасцей? Будзе праходзіць своеасаблівы абмен ведамі, які, несумненна, значна ўзбагаціць студэнтаў.

Чаму, напрыклад, філолагам не наведваць музей гістарычнага факультэта. Тут ёсць шматлікія копіі антычнай скульптуры, бюсты старажытных пісьменнікаў Грэцыі, Рыма. Вывучаючы антычную літаратуру, проста грэшна абыходзіць тое, што, як кажуць, пад бокам.

Чаму б тым жа філолагам не пацікавіцца музеем біяфака, лабараторыямі фізфака, хімфака? Няхай бы ў сваю чаргу хімікі ці фізікі запрасілі пачытаць лекцыі па літаратуры і мастацтву выкладчыкаў філфака, па гісторыі — гістфака і г. д. Ці ж такі абмен экскурсіямі і лектарамі не дапамог бы ўзбагачэнню нашых ведаў? Думаецца, дапамог бы.

Веды прыходзяць не толькі на лекцыях і ў бібліятэцы. І, можа, не толькі сумеснае жыццё ў адным пакоі фізікаў і лірыкаў будзе ўзбагачаць кожнага з іх. Проста ўзмацненне дружбы розных факультэтаў павінна пачынацца з атмасферы, насычанай ведамі. Тут сваю ролю маглі б сыграць курсавыя вечары. Яны чамусьці не праводзяцца ў нас. А няхай бы завязалася дружба, скажам, аднаго з курсаў біёлагаў з філолагамі, на курсавым вечары філолагаў, якія запрасілі біёлагаў. Упэўнены, што не толькі б самадзейнасць глядзелі госці, не толькі б танцавалі з нашымі дзяўчатамі і хлопцамі, але зайшла б і гутарка аб ладах і неладах на сесіях, аб тым, што вывучаеш.

Скажу яшчэ аб адным. Пара пакінуць займацца і ўгаворваннямі недысцыплінаваных студэнтаў. Вышэйшая адукацыя ў нас пакуль што неабавязковая і няма чаго трымаць ва універсітэце студэнтаў, якія ад сесіі да сесіі павялічваюць сваю акадэмічную запазычанасць. Мала таго, што яны самі не вучацца, яны адбіраюць каштоўны час у тых, хто хоча вучыцца.

Пасяджэнні бюро камсамола філалагічнага факультэта праводзяцца амаль кожны тыдзень і часцей за ўсё па пытаннях наведвання лекцый і паспяховасці. Студэнткі Каждзіна, Карэтнікава, Кароткіна, Эйсмант, Васілеўская, Сілко, Шалышка маюць па дзве і больш акадэмічных запазычанасцей. Усіх іх вызывалі на пасяджэнні бюро, угаварвалі. Але гэта, вядома, не дапамагло: усе яны, за выключэннем Кароткінай і Карэтнікавай, яшчэ не ліквідавалі запазычанасцей, працягваюць прапускаць заняткі.

Вызываць іх зноў на бюро, зноў угаварваць? Па-мойму, гэта будзе залішне. Калі не хочаш набываць ведаў, які ж ты студэнт! Будзем жа выкарыстоўваць усе мажлівасці, якія дае наш універсітэт.

**В. КОШМАН,**
**член бюро камсамола філфака, адказны за акадэмічны сектар.**

# Ваша слова, камсамольцы!

*У «Комсомольской правде» ад 9 лютага 1965 года змешчаны артыкул «Решает совесть курса». Артыкул усхваляваў студэнтаў, выклікаў спрэчкі.*

*Сёння прадстаўляем слова камсоргам Ніне Аўсеенка (3 курс геафака) і Тамары Шарпонавай (2 курс рускага аддз.) Можа не ўсе іх думкі правільныя, але цікавыя. Калі ласка, сябры, запрашаем выказацца і вас.*

## МОЖАМ І САМІ

**На курсе ў нас больш паловы студэнтаў з вытворчым стажам. Яны могуць самі рашаць пытанні, звязаныя з вучобай і бытам студэнтаў курса. Большасць іх пасля заканчэння універсітэта будуць працаваць настаўнікамі. Пагэтаму яшчэ ў студэнцкія гады неабходна вучыцца сур'ёзна і самастойна рашаць многія пытанні быту і жыцця. Напрыклад, размеркаванне стыпендыі сярод студэнтаў рашалася дэканатам, цяпер жа — актывам курса. Такое рашэнне гэтага пытання з'яўляецца найбольш правільным.**

**Мы падтрымліваем прапанову аб стварэнні курсавой грамадска-выхаваўчай камісіі, у склад якой павінны ўвайсці актыў курса, а таксама многія студэнты і выкладчыкі. Мы лічым, што функцыі камісіі павінны быць наступныя:**

**— размеркаванне стыпендыі і месца ў інтэрнаце;**

**— прапаноўваць лепшых студэнтаў на імянныя стыпендыі;**

**— разглядаць пытанні здачы і пераздачы экзаменаў;**

**— без абмеркавання камісіі адміністрацыя не мае права выключаць і зноў прымаць студэнтаў.**

**На апошнім годзе навучання:**

**— рыхтаваць характарыстыкі на выпускнікоў;**

**— прапаноўваць спіс студэнтаў у аспірантуру;**

**— прымаць удзел у размеркаванні маладых спецыялістаў на работу.**

**Н. АЎСЕЕНКА.**

## Ініцыятыва і самастойнасць

Студэнцкая ініцыятыва і самастойнасць! Яна можа даць значныя поспехі ў вучобе. Многія студэнты маюць камсамольскія даручэнні, удзельнічаюць у гуртках мастацкай самадзейнасці.

Згуртоўваюць студэнтаў і сумесныя культпаходы ў кіно, тэатр, абмяркоўванне іх.

Але вось прайшла сесія і ў нас зноў паявіліся непаспяваючыя. Іменна ў гэтым пытанні патрэбна ініцыятыва і самастойнасць камсамольцаў. Тут адчуваецца наша сур'ёзная недапрацоўка. Мы яшчэ не дасягнулі таго, каб кожная двойка ў групе была тэмай для сур'ёзнай размовы. Арганізацыя камісіі пры камітэце камсамола па прыёму студэнтаў ва універсітэт будзе садзейнічаць таксама пад'ёму паспяховасці. Хіба не здараецца, што ва універсітэце аказваюцца выпадковыя людзі?

Нам трэба назаўсёды пакончыць з такой з'явай і мы прыкладзем усе сілы, каб дабіцца гэтага.

**Т. ШАРПОНАВА.**

# У НАВУШНІКАХ... ШУМ

Кожны раз, калі я заходжу ў фанетычную лабараторыю, я ўспамінаю пачатак вучобы. Слухаючы лекцыю па англійскай мове, мы замацоўваем прапушчаныя словы, гукі тут, у лабараторыі. Вынік такога вывучэння паказала экзаменацыйная сесія.

Пачаўся другі семестр. Сталі вывучаць больш цяжкія тэксты. Лабараторыя яшчэ больш павінна дапамагаць нам. Але... Заходжу ў лабараторыю. Яна амаль пустая. Прашу ўключыць 16-ы ўрок па Матвееву.

— Пятая разетка злева, — сказала мне лабарантка і падае навушнікі. Саджуся за стол, разгортваю падручнік, падрыхтаваўся да прыёма. Да слыху далятаюць абрыўкі фраз. Гляджу на радкі зверху ўніз па дыяганалі і не магу знайсці перадаваемы тэкст. Перагортваю лісты, зноў пільна прыглядаюся. Вынік той жа...

Нарэшце, удалося «злавіць» тэкст, але хутка зноў яго губляю. Яшчэ праходзіць адна хвіліна і ў навушніках чую:

— Урок 17-ы.

На другі дзень замежная мова. Выкладчыцы пакажу замест урока лічбы, пакажуць іх і другія студэнты замест таго, каб адказаць на лекцыі вымаўленне і інтанацыю. Значыць, усё тое, што я мог бы набыць у лабараторыі, вывучаю на ўроку.

Як ні дзіўна, але напрошваецца такое пытанне: для чаго вялізны пакой абсталяваны фанетычнай апаратурай, якую абслугоўваюць лабаранткі? Для чаго наогул такая лабараторыя? На маю думку, яна існуе для самападману і заспакойвання выкладчыка.

А хіба не магла б гэтая лабараторыя быць важным аб'ектам вывучэння замежнай мовы, як у пачатку вучэбнага года?

Лабаранткам трэба ў самы кароткі тэрмін замяніць сапсаваную запіс на плёнках новай. Тады лабараторыя не будзе пуставаць.

*А. СКРОБАТ,*
*студэнт філалагічнага факультэта.*

Рэдактар П. СІЛІВАНЧЫК.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Выдавецтва «Звязда»
АТ 01857. Тыр. 2000. Зак. 931.